Цэна асобнага нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень

Адрэс рэдакціі і адміністраціі: Вільня, Віленская вул., № 29.
Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г. 2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцэй: на 1 г.— 4 р. на 6 мес—2 р. 3 мес.—1 р. Перамена адрэсу—20 кап.
Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі. Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фамліей і адрэсам таго хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам з фаміліей, хто не захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рэдакція пакідае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год IX. 25 Красавіка 1914 г. № 16

Пры гэтым нумэры разсылаецца падпісчыкам „ВЯЛІКОДНАЯ ПІСАНКА“.

## Змаганьне за правы Гас Думы.

Новы прэдседацель рады міністроў, Горэмыкін, с перших дзён, як дайшоў ўласьці, пачаў ўсё болей і болей урэзываць правы Гасударственнай думы На што яму гэта патрэбна, трудна згадаць: і тая Дума лішне ўжо слухае, што урад ей скажэ, ды спаўняе ўсе жаданьня міністроў. І ўсё-ж такі Горэмыкін адмовіўся даваць атказ Думе на запросы, радзючы дэпутатам звертацца да яго кожнаму асобне—і то ня ў Думе, а у яго хаці. Але гэтаго мала: новы прэмьер, па праўдзе, скасаваў правы дэпутатоў свабодна гаварыць у Думе тое, што яны думаюць і за прамовы, каторые не да спадобы ураду, цягне дэпутатоў пад суд.

Як жэ можэ бараніцца ад гэтаго Дума? Яна мае адну дарогу: адмовіцца ад асыгноўкі грошы казне на расходы. А грошы сёлета урад просіць багата: 3½ мілліярда! (мілліярд=1000 мільёноў).

У ваўторак павінна была разглядаць смету даходоў і расходоў гасударственых. Левые партіі пастанавілі не прыступаць да гэтаго, пакуль правіцельство не прызнае свабоды дэпутацкаго слова. Але правые, націоналісты і польскае коло, аткінулі гэты праект. Вось жэ, калі прэдседацель рады міністроў, Горэмыкін, узышоў на трыбуну і хацеў гаварыць, левые паднялі страшны гоман каб не даць яму сказаць слова. Дарма прадседацель Думы, Родзянко, прасіў дэпутатоў супакоіцца, шум не сціхаў. Тады Родзянко папрасіў Горэмыкіна пакінуць трыбуну, пакуль ня будзе спакойна а тых дэпутатоў, каторые найболып гаманілі, выдаліў з Думы ажно на 15 заседаньнёў. Соціал-дэмократ—Чхэідзе не хацеў выйсьці з Думы, дык увялі сто стражнікоў, каб вывясьці яго гвалтам, і ён уступіў толькі перад сілай. Пачэкаўшы крыху Горэмыкін ізноў памыкаўся гаварыць, але яму ізноў не далі. Ізноў з Думы выдаліла некольκі дэпутатоў — соціал-дэмократоў і трудавікоў, ізноў уводзілі стражнікоў, каб вывясьці сілай непакорных. Толькі за трэйцім разам удалося Горэмыкіну сказаць, што ён хацеў.

Што будзе далей, трудна згадаць. Адно ясна: калі Дума дасць грошы ураду, дык яна гэтым пакажэ што дае згоду на урэзываньне яе правоў. Калі-ж не дасць, дык яе пэўна распусьцяць.

## Слова і дзела.

На словы кожны шчодры. Але як мала з іх дзела бывае!

Мы чуем гутаркі, што трэба праўды на сьвеці шукаць,—але-ж тые пракокі яе якраз проці праўды йдуць.

Мы чытаем па газэтах і кніжках, што трэба памагаць бяднейшаму і слабейшаму, што ўсе нації павінны жыць у добрай згодзі і шанаваць адна адну. А тымчасам бадай за кожным словам хаваецца камень, каб ударыць таго, хто даверыўся пекным словам...

Так скрозь у жыцьці вядзецца. Так вядзецца і на нашай зямлі, дзе людзі розных націй побоч жывуць, дзе здаецца, супольные справы і жаданьня павінны іх злучаць у адну моцную і дружную сямью. І тутака йдзе вайна ўсіх проці ўсіх

Ня дзіва, што мы ўжо пакінулі верыць пекным словам. Мы, беларусы, хаця на лік—найвялікшая сіла у Краю, не спазналі йшчэ гэтай сілы і ходзім пакорна ў ярме, што накладаюць на нас ду жэйшые націі. Мы бачылі заўсёды, як с цемнаты нашай карысталі чужые, ужываючы нашу сілу дзеля сваіх спраў. А слоў—пекных слоў зусюль чулі і чуем бяз ліку.

Слоў—многа,—дзела—зусім німа. Справядлівей — не было дагэтуль. Толькі памалу пачынаюць зблізкацца між сабой людзі розных націй, каторым усім роўна цяжка, каторые супольнай працай маняцца здабыць лепшае жыцьцё. Будзіцца народ—адвечны гаротнік, «дэмос». Будзяцца, і дэмократычные рухі ў розных націях нашага краю пачынаюць зліваццаа ў адно—ў адну вялікую рэку, што нясе нас усіх да сьветлай хоць далёкай будучыны.

Бяз лішніх слоў, бяз лішняго гоману ідзе гэтая праца на самым ніэе грамадзянскаго жыцьця.

І гэта бачуць лепшые людзі, што стаяць «на версе»: гэта бачыць *краёвая* інтэлігенція. Тутака так сама пачынаецца нешта новае: тые, што ешчэ ўчора чураліся адзін аднаго, падаюць сабе рукі, каб успамагаць слабейшых у іх рабоці дзеля карысьці працоўнаго народу і нашаго краю.

«Каму дадзена многа, с таго многа і зышчецца». І вялікі доўг перад народам, перад мільёнамі гаротнікоў, што праз сотні гадоў моўчкі рабілі да раньня да ночы, ляжыць цяпер на краёвай інтэлігенціі ўсіх націй: яна той доўг павінна сплачываць.

Такіх, што сплачываюць доўг свой мала. Але яны ўсё-ж такі ёсць. То тут то там бачым, як атрываюцца уселякіе таварыствы і хаўрусы, ў каторых працуюць людзі розных націй дзеля карысьці ўсяго тутэйшаго народу, ня гледзячы, чы то будуць беларусы чы літвіны, палякі чы жыды. Вось, хаця-бы у Вільні маем таварыство падмогі коопэраціі, другое—таварыство падмогі хатняму рэмэслу і народнаму штукарству, а йшчэ нідаўна было тутака бюро апекі над эміграктамі,—і ўсе яны роўна клапоцюцца аб карысьці народу, ня гльдзячы на тое, якой мовай ён гаворэ, да якой веры належыць.

На гэтым — і толькі на гэтым грунці *працы дзеля народу* могуць з'еднацца грамадзяне нашаго краю розных націй. Ніхай кожын працуе дзеля сваей *національнай культуры*, ніхай любіць усей душой сваё роднае, ніхай бароніць сваіх братоў, сваю мову ад здзеку і гнібеньня. Але ніхай памятае, што доля краю залежыць перш-наперш ад долі бедната гаротнай; ніхай памятае, што пакуль селянін цёмен і бедзен, датуль ніякі поступ у нашай старонцы ня можэ развівацца: ён ня знойдзе для сябе моцнаго фундамэнту. І вось затым-то, поруч са сваей національнай работай дзеля развіцьця сваей культуры, кожын інтэлігент, каторы хочэ быць не чужынцам на нашай зямлі, а поўнапраўным грамадзянінам, павінен борзда брацца да работы дзеля прасьветы і экономічнаго падняцьця многамільённай грамады тутэйшаго працоўнаго люду, ня гледзячы на націю і веру селяніна-гаротніка, рабочаго ці рэмесьніка.

Гэта—доўг краёвай інтэлігенціі, каторы можыць па яе сумленьні і павінен быць сплочэны.

а—н—а.

## Пан Трудоўскі.

Каля шырокаго, абсаджэнаго бярэзінаю гасьцінца, што йдзе з Воўкавыска да Гродны на ўзгорку раскінуўся невялічкі маёнтачак. У самай сярэдзіне яго відзен маленькі, пад старою прадзіраўленаю стрэхаю, панскі дамок з дрэўляным скрыўленым ганачкам, а трошкі атступіўшы ў віз пад высокімі прыгожымі таполямі стаяць ці, праўдзівей, лежаць другіе будынкі: гумно, абора і стайня. Стрэха з іх ужо даўно спаўзала і раскідана ветрам па полю; сьцены пакрывіліся і ўрасьлі у зямлю; кроквы згнілі і зваліліся. За домікам, вышэй на ўзгорку, відзен прысохшы і абломлены ветрам і людзьмі садок.

Некалі гэты маёнтачак быў абгароджэн парканам, але як ударажалі дровы, дык суседзі вясковые разабралі па трошку паркан на топліва і цяпер на тым мейсцы, дзе калісь была агародка, стаяць адны пачарнеўшые гнілые слупкі, каторые служаць нямымі сьведкамі таго, як нішчыцца і марнее гэты маленькі маёнтачак.

Гдзе-ж ўласьціцель гэтае адзінокае, убогае гаспадаркі? Ён тутка жыве у пакоях свайго старога доміка,—гэта пан Трудоўскі, стары вясковы вучыцель.

Зусім ён ужо знядужаў, сагнуўся у дугу і ледзве—ледаве цягне ногі. Выйдзе стары вучыцель на ганак, сядзе на ўслончыку і доўга, доўга ўздыхаючы дзівіцца на свае палеткі ды сенажаці і хочацца яму,—старому, пайці гуды паглядзець як жыто каласуе, ці вяліка парасла на лузі трава, але ня можэ, бо німа ні каплі сіл. Ешчэ нідаўна Пан Трудоўскі уставаў додня і абходзіў сваю ўласнасьць, паказваючы парабкам, як трэ лепей гараць, касіць, сеяць, а цяпер з ганку ня можэ спаўзаці,—зусім перэсталі его слухаць ногі. Божэ мой! Як старасць знушчаецца над людзьмі...

Жыве пан Трудоўскі не адзін, а са сваею паняю Зосяю. Старэй і яна ужо зрабілася,—зморшчылася, згорбілася і зусім знядужала.

Цяжка і нудна жыць старым у адзіноцтве бяз блізкіх людзей, каторым можна было-б аткрыць сваю збалелую душу, але што зрабіць, пакуль трымаецца душа у целі трэ да апошняго часу нясьці на сабе цікар свайго лёсу.

Сідзяць абое старые у сваём цёмным маленькім пакоі на скрыпучых с прадзертымі падушкамі крэслах; сідзяць кожан дзень зранку да вечэра і маўчаць. Дый аб чым ім гаварыць? Тое, што было прайшло навекі і як у воду канула; цяперашняе нудное і недае ніякай тэмы для размовы, а тое, што будзе — цёмнае як хмара і апрыч магілы ды крыжа там нічога больш німа, аб ём не тое што гаварыць, але нават і ўспамінаць не варта. Моўчкы старые і мову забылі, толькі ўздыхаюць ды стогнуць... Іншы раз, як толькі палепшае здароўе, стары вучыцель вып'е чарку—другую сьлівянкі любіць ўслух думаць пра сваё пройдзёнае жыцьцё. Збоку, слухаючы яго, здаецца што ён с кімнебудзь гаворыць, але не: гэта у яго такі нораў ўслух думаць.

От сядзіць сабе пан Трудоўскі з жонкаю восенным вечэрам ля стала, на каторым стаіць бутэлька, дый гаворыць сам да сябе.

— Божэ мой, як хутка, пралцело маё жыцьцё!.. Ці-ж даўно я быў ешчэ бязвусым паничом? Ах, моладасць весна жыцьця, куды ты так хутка ўцекла? Ці е на сьвеці якіе чары, каторымі можна было-б цябе, моладасць, вярнуць назад? Ці е такіе коні, каторымі можна было-б цябе дагнаць? Не, адзін раз ў року дрэво цьвіце, — адзін раз на жыцьцё і моладасць бывае... Такое назначэньне даў Бог усяму сваймуy створаньню.

— Паня, налій мне чарку! трэ выпіць за моладасьць.

Выпіўшы чарку слівянкі і трошкі пасядзеўшы, пан Трудоўскі зноў думае ўслух:

— У нашым жыцьцю бываюць такіе здараньня, каторых ніколі ня можна забыцца; с цемры пройдзенаго яны зіхацяць, як зоры з неба у восенную ноч і асьвечаюць нам пуціну пройдзеннаго жыцьця. Аглянешься назад і пры іх сьвятле бачыш усё пражытае, як на далоні...

— Даўно учыўся у Жыровіцкай бурсе, а ўсё помню як цяпер... От ідзе урок арыхмецікі... Вучыцель сярдзіты, прыдзіраецца; мы збіваемся у лічбе. Беда, вызвалі усіх на сярэдзіну клясы, палажылі на ўслон дый давай цьвічыць розгамі. Плач, лямант... Але во, у цёмных калідоры заенчыў звонік,—пачалася перадышка. Мы трошкі аправіўшыся, гуртам высыпалі на пляц і давай граць у сьнежкі. Ўсё зразу забыта: не чуваць ні енку, ні плачу; усе скачуць, сьмяюцца сьпеваюць... Не было помсты і проці вучыцеля, бо тагды усе верылі, што бярозаво вецце пры адукацііі ня менш патрэбно чым гусінае пяро.

— Скончыў бурсу, пераійшоў у Віленску сэмінарыю... Вялікое место, шумлівые вуліцы, новае таварыства, — усё гэта спачатку вельмі

## У зашчыту прэссы «недзержаўных» націй.

У Кіеві ёсць таварыство газэтных працоўнікоў, да катораго належыць і журналіст з нашаго краю. Гэтымі днямі адбыўся агульны сход членоў таварыства, каб разглядзець новы праект закону аб друку, каторы ўжо прайшоў праз думскую камісcію і неўзабаві будзе разглядацца Гас. Думай. Поруч з гэтым разглядалі і палажэньне газэт наагул, а асабліва газэт «недзержаўных націй»—украінцоў, беларусоў, літвіноў, жыдоў і др. Член таварыства. В. Прокоповіч, апаведаў, як ціснуць на Украйне украінскіе газэты: адміністрація чэпляецца ня толькі да тых людзей, каторые пішуць і выдаюць газэты на украінскай мове, але нават да іх чытачоў, у каторых робюць обыскі затое, што выпісываюць гэткіе газэты.

І. Луцкевіч (з Вільні) казаў аб беларускай і літоўскай прэссе. 1 яе палажэньне шмат у чым падобна да палажэньня украінскай. З беларускімі і літоўскімі дэмократычнымі газэтамі ваюець ня толькі адміністрація, а і клерыкалы: шмат дзе ў касьцёлах кажуць казаньня, каб селяне гэткіх газэт не чыталі. З літоўскімі дэмократычнымі газэтамі бываюць нават такіе здарэньня, што слугі забіраюць і хаваюць нумэры іх ад сваіх паноў, каб тые не чыталі. Ня гледзючы на гэта, краёвая дэмократычная прэсса ўсё узрастае, а ў іншых газэт лік нумэроў даходзіць да колькіх дзесяткоў тысяч, каторые расходзяцца па сёлах («Liet. Uk n».).

Цяжка жывецца — паводлуг слоў М. Літвакова — і жыдоўскім газэтам.

Сход пастанавіў гэткую рэзолюцію:

«Агульны сход, выслухаўшы даклад аб палажэньні краёвай украінскай прэссы і дапаўненьня аб палажэньні беларускіх, літоўскіх і жыдоўскіх газэт і прызнаючы, што кожная нація мае права мець сваю прэссу ў роднай мові ці гутарцы,—лічыць, што праект закону аб друку, апрацаваны камісіей гасуд. Думы, будзе найцяжэй адбівацца на гэтай прэссе і што яе трэба бараніць гэтак сама, як інтэрэсы і правы расейскай прэссы.—Поруч з гэтым сход выказывае жаданьне, каб расейскіе газэты давалі чым больш мейсца дзеля асьветленьня спраў жыцьця і культуры «недзержаўных націй» ды палажэньня іхняй прэссы».

**Г. Б.**

## Вясной з вёскі.

Прыйшла цудоўная весна. Пряляцелі птушачкі, запеялі песьні, пачалі майстраваць цёплые хаткі сваім дзеткам. Зважна ходзіць па лузе, бытцым каморнік. бусел. Ва ўсё горла крычыць варона, нібы хто яе душыць. Розных коляроў матылькі купаюцца у цёплых праменях сонца. Гудуць пчолкі, лятучы у здабыткі. На дрэвах зьяўляюцца лісьцікі, сарамяжна зірнулі пралескі. Пекната ды толькі! Можна залюбавацца на ўсе праявы чараўніцы—вясны. Вока ня можэ адарвацца ад сіняго неба, што зычыць ласку. Раскрыўбы, здаецца, вопратку, каб прамені сонца песьцілі грудзі, улівалі туды моц, адвагу, ахвоту да жыцьця, каб вецер—лятун на сваіх крылах нёс да сэрца цудоўные казкі аб лепшым жыцьці.—Куды ні ўзглянь—усё усьміхаецца, усё гамоніць, што сярдзітая зіма з завірухамі прайшла. Нішто і ніхто і думаць няхочэ, што мяцеліцы ізноў надойдуць, пачуюцца хаўтурные яе сьпевы, а ва ўсе грудзі усё жывое пье асалоду уваскрэсеньня да новаго жыцьця.

Крэпка, колькі змога, ухваціляся пралесачка карэньчыкамі за зямельку—матку ды пнецца у верх да сонца; бытцым крыўдуючы, што лес засланяе яго, што ён бліжэй да яго ды болей атрымлівае ласкі. Усё наўзахваткі сьпяшыць далучыцца да жыцьця.

Нeяк сумна, зробіцца на сэрцы, бытцым нехта незгаданы смокчэ а яго кроў калі пачуеш:—«ужо колькі нядзеляк ані бульбінкі, ані жменькі сена»,—калі перад вакном пяройдзе на пашу худзенькая кароўка! Гатоў забыць усю пекнату, што ўвакруг бье ў вочы, якой поўна сэрпэ, але селянін пaглядае ужо весялей, крокі яго раўнейшые, у вачах блішчыць надзея. Надзея сухотнаго, а усёж надзея! Ен ужо вымеў, а у лепшым разе, выметае свой засечак, але надзея ня кідае яго, калі зірне на ніўку, што гэтак хараша зелянее. Вачывідкі падыймаецца жыцейка маладое, дакляруе хоць колькі разкоў накарміць у смак свайго працоўніка. Мо сягоньня ці пробаваў ён хлеба, але старэнна бярэцца за сошку, с сьвятой малітвай кідае зерняты у нагрэтую зямельку. Шэпчэ сьвятые словы, з думкай звертаецца да Найвышняго, каб судзіў Ен скарыстаць з гэтай працы.

Працуе с самаго раньня да ночкі на вузенькім сваім шнурочку вясковец. сонцэ, і сівер пачырванілі яго твар. Але хочэцца верыць, што не заўсёды будзе ён с палавіны зімы галадаць, чэкаць з нецярпеньнем таго часу, каб, нажаўшы якіе пяць снапкоў, скарэй абмалаціць ды накарміць сваіх дзетак. Хочэцца верыць, што мы ўсе будзем накормлены, абуты, што нашэ сэрцэ ня будзе абліваццa кроўю, калі зірнем на твар нашых дзетак, якi падобен да воску.

**Зрэбны.**

## Кароткі фэльетончык.

### „Пан“.

Бывае, што і на гразі вырасьцэ краска, і мае стройны колер і добра пахне, але ніколі ня можэ быць таго, каб свіньня, выкачаўшыся у балоці, не панесла на сабе гразі. Не раз у жыцьці людзей здарывалося даканацца у гэтай праўдзе, і быць можэ с таго зложылася і пагаворка: «не дай Божэ мужыку быць панам».

Бо такі пан горш сьвіньні выкачанай у балоці.

Мы тут адмецім, што гаворым аб «мужыцтве» душы, а не папероў.

Неяк раз—калі і дзе гэта было, казаць ня буду — засцрэчаўся валасны пісар с чыноўнікам казначэйства аб тым, што—значэ яму, пісару, не выпадае вадзіць знаёмства з «крэстьянкамі».

Што? каб я падаў ей руку!... Яна — мая «падчынёная» — а я з ей знаёмства буду вадзіць?.., Была-б яна хоць найлепшая — мне ня гонар гэта!

Чыноўнік моцна стукнуў далоняй па стале.

— І саўсім не твае «падчынёные»! Ты іхні служка, наймiт...

Пісара кальнула у самую нырку.

— Ды я страчу тады «аўторытэт» і «карьеру».

Чыноўнік ешчэ мацней стукнуў далоняй па стале, і нявeдама можэ ён у канцы стукнуў бы і па тым мейсцы; дзе бярэцца розум у пісара—толькі на гэты час надыйшоў прадседацель валаснога суда.

— Падумаеш — «пан» гэтакі! А даўнож гэта было, як сам лапці насіў і з ражкі кашу еў!

Пісару здалося, што прадседацель кінуў справядлівае абвінавачэньня у нейкім страшэнным яго праступку.

Ен папірўхнуўся ад злосці і яму заняло мову.

Такіх «паноў» многа нарадзіў сьвет у наш век, і іх гэтулькі развялося, што хоць на вілах растрэсай — замест гною.

Толькі і тады карысць з іх малая — бо на такім гнаю нічога ня вырасьце.

**Смаргонецъ.**

## Бьюць на трывогу званы...

Бьюць на трывогу званы,
Клічуць да новай вясны,
К Новаму Богу завуць,
Бьюць на трывогу званы,
Бьюць, бьюць!..

. . . . . . .
. . . . . . .
. . . . . . .
. . . . . . .
. . . .

Рэж на дарозе дзярно,
Што ногі раніць даўно,
Ў глыб запускай свой лямеш,
Рэж на дарозе дзярно,
Рэж, рэж!

Крыж прад вачамі стаіць,
Крыж абвіла помсты ніць,
Процьма у доўжкі і ўзвыж,
Крыж прад вачамі стаіць,
Крыж, крыж!

Рвуць твае жылы кругом,
Родны раскідалі дом,
Гібель табе скрозь равуць,
Рвуць твае жылы кругом
Рвуць, рвуць!

А на трывогу званы
Бьюць на парозе вясны,
К Новаму Богу завуць,
Бьюць на трывогу званы,
Бьюць, бьюць!

**Я. Купала.**

Вільня 27/I—14 г.

---

мяне цешыло, цікавіло Началося учэнё; як і у бурсе яно было сухое, прыкраё. Вучыцелі ня мелі да сваіх пястуноў ні спогадзі, н жалю. Праўда секлі меньш, чым у бурсі, але затое мацней.

— Хутка йшоў час; год бяз спынку бег за годам, зменяючы адзін другога Я вучыўся ня кепска і от, дзякуй Богу, дабраўся ужо да чацьвёртаго клясу. Помню раз на Вялікадню скупілося нас таварышоў, чэлавек мо дзесяць дый пайшлі мы на спацыр за Гостру Браму. Як добра змерклося, чорт нас торкнуў зайці да Гітлі у трахтыр. Залезшы у бакоўку, дзе нікога не было мы стрэбавалі папірос, гарэлкі, мёду. От пабалагурыўшы трошкі а том ды ¦а сём мы выпілі, закусілі, а потым зацягнулі вясёлую песьню:

Чарка ўсё на сьвеці робіць,
З ёю добра жыці
Ад нуды і ад хваробы
Можэ пасабіці...
Што за золата яна,
Ў полі і ў дарозі,
Як ту чарку пьеш да дна
Зімой на марозі...
І хто жыў і хто умёр
Чарка спамінае,
Хто жаніўся, хто хрысьціўся
Таго не мінае...

Якраз у гэты час раптам атчыніліся дьзверы і да нас у бакоўку — шась ацец інспэктар. Худы, высокі як ражон з гострэнькаю рыжаю барадою. Песьня ўраз абарвалася. Інспэктар паглядзеў на нас с пад цёмных акуляроў дый кажэ:

— Віншую вас, рытары, с першаю маёўкю... Мы скамянелі ад страху і у якой позі хто сядзеў, у такой і застыў: ніхто і пальцам не пашавеліў. Ацец інспэктар дастаў с свае глыбокае кішэні маленькі леестрык і, занатаваўшы туды усіх нас, пайшоў сабе да-дому.

Беда! неба над намі зацягвалося хмарамі, напаўзала грозная бура; трэ было чакаць грымотаў.

От на другі дзень нас зазвалі у актаву залю і абвесьцілі, што усіх нас дсесяцярых педагагічна рада пастанавілі за курэнё і лайдацства сключыць з сэмінарыі. Гэты прыгавар гостраю больлю атдаўся у нашым сэрцы. За што,—пыталіся мы,—зламано нашэ жыцьцё? За якую віну загублена гэтулькі працы і маладых гадоў?.. Хрыстос прашчаў разбойнікоў, блудніц, а яны настаўнікі нашы, не даравалі нам, іх пестунам, нявіннай дуронасьці. Ай, людзі, людзі, як у вас ешчэ многа звярыных нoравоў!.. Толькі цяпер мы сваім сэрцэм пазналі, што і ўзапраўды *homo homini lupus est.* (чэлавек, чэлавеку—воўк). Прасіць, каб перэйначыла пэдагогічна рада свой прыгавар над намі, — не прасілі, бо добра ведалі, што барджэй камень загаварыць, чым нашы настаўнікі літасць з'явюць да сваіх пястуноў.

Посьле гэтае цяжкае прыгоды, мы пазбіралі свае манаткі, злажылі у мяшкі і, ўзваліўшы іх на плечы, пацягнулі з Вільні да—дому. Адыйшоўшы можэ вярсту, ці дзьве ад места, мы селі на кургане ля самае дарогі і ўскінуўшы апошні ўзгляд на Вільню, моцна, колькі маглі грудзі, засьпевалі:

Бадай тая Вільня
Пяском закурыла;
Як яна нас маладзенькіх
Дый з дарогі збіла..

Потым на развітаньне распілі бутэльку моцнае гарэлкі, пацалаваліся адзін з другім дый разыйшліся па ўсіх канцох свае Мацеры-Беларусі...

— Паня, налій ешчэ чарку... бо вельмі цяжка на душы.

— От прыйшоў я да дому у сваю Слонімшчыну... Маці як дазналася, якая надамной страслася цяжкая беда,—горка старая заплакала дый кажэ:

— Што зрабіць? усім кіруе Бог; проціў Яго святое волі не папрэш... Цяпер табе сынку, трэ падумаць аб сваей будучыне. Бацька твой усё жыцьцё атдаў цэркві, — служыў дзяком, а ты спробуй шчасьця у вучыцельстві,—паслужы дзеля народу.

Паслухаў старой; падаў прозьбу у гродзенску дырэкцію і зараз атрымаў паперу, што назнаючаюся пачатковым вучыцелям у мястэчка Зарніцу.

З радасьці, зараз, па духоўнаму звычаю, ажаніўся і ўмесьці з жонкаю стаў працаваць на ніве народнай, На аднэй палавіне школкі я учыў хлопчыкаў, а на другой жонка — дзеўчатак. У часе змены хлопчыкі і дзеўчаткі сходзіліся на гульні ды забавы, каторые вяліся пад нашым кірункам. Божэ! якіе гэта былі шчасьлівые хвіліны нашаго жыцьця...

Стары вучыцель схіліў голаў і замоўк... У старае пані закалыхаліся грудзі і з затуманеных вачэй закапалі сьлёзы дробные як восенны дождж ык. Старым жаль было пройдзенаго жыцьця...

— Стаў вучыць дзяцей.—думаў ўслух да-

## Жальба.

Сумна, цяжка ў чужым краю
  Сіраціне жыці:
Хоць сьпеваюць птушкі ў гаю,
  Жаўваронкі ў жыці;
Хоць на полі добра родзіць,
  Хоць ня бедны людзі,—
Хоць так сама сонцэ ўсходзіць
  І ўздыхаюць грудзі!
І ў дзяўчыны тые-ж брові,—
  Агнявые вочы—
Ды ня знойдзе ў іх любові
  Чужынец сірочы!
«Людзі брацьця»—ладны словы!
  Ды «брат» ці істнее?..
Кроў з другога неба Бога
  Ў жылах іх агнее.
Ты чужы, з другой радні ты!
  І цябе ня любюць...
Ты як вораг! Хоць прыбіты,
  А цябе ўсе губюць.
Ты адзін, як тая пальма
  Ды на чужой глебі...
Сумна, цяжка,—твая жальба
  Гіне ў чыжым небі..

**І. Піліпоў.**

# З Беларусі і Літвы.

### З Віленшчыны

#### С Крайскай валасьці.

Час ляціць упярод, перэскаківаючы на сваім шляху і горы і нізіны. За адзін год, каторы я ня быў у роднай ваколіцы сваей, я спаткаў шмат перамен тутака.

Раней уся наша ваколіца пакрыта была цёмнымі лесамі, каторые належылі да тутэйшых паноў. Лясы гэтые мала-памалу высеклі, праўда, селяне мелі часамі добрые заработкі у купцоў, але затое цяпер дайшло да таго, што німа дзе і веніка навязаць і неяк сумна робіцца гледзючы на пустые, шэрые пасекі быўшых лясоў.

Пайшоўшы у вёску якую і угледзіўшы пустату на вуліцах, здаецца табе, што нейкая пошэстная хвароба вострай касой сваей зніжтожыла усю моладзь ..—Што гэта? Куды усе хлопцы і дзеўчаты разбрыліся?—пытаешся у стрэчнаго дзеда --У Амэрыку паехалі!—адказывае ён. — Усе? — Усе! — махаець ён рукой і ты астаешся у нейкім цяжкім раздумьі: шкада маладых сіл, каторые за нешчасны доляр усю энэргію і здароўе сваё атдаюць і дамоў вертаюцца ужо зморэные, выпрацаваные... Сумна..

Як тая дзікая крапіва на дзядзінцу, цьвіце толькі адзін гандэль у нас, каторы ніколі не марнеіць. Гэта тая старая і адвечна новая казка — гарэлка. Нідаўна пеялі і цяпер ешчэ пяюць усе у адну дудку, што жыды-шынкары губюць мужыка, — каб не яны дык гарэлка скісла-б на квас, бо хрысьціянін ніколі не адважыўся-б гандляваць ею, памятаючы на на душу сваю. Але вось, дзякаваць Богу, жыды перэсталі у нас займацца гарэлкай і іх замянілі самі селяне па вёсках. Як той казаў—«пазнаў жыд грунт, а селянін фунт».

Па вёсках у нас шынкарствам займаюцца найболей бабы — «бабская работа» — і па вёсках пануюць пастаянные разбоі і безпарадкі ад гэтай атруты, каторая абхапіла селян гнільлём сваім.

Каля нас, напрыклад, найболей развіта пьянство і, само сабой, шынкарства у фальв. Ізбішчэ, у ф.—Запруды, у в.—Рэпішчэ, у в. Цагельні і у др.

Каля нас пайшла цяперака прадажа зямлі з рук перакупшчыкоў. Прадаюцца землі у Глубочанах, Такарах, і Мацкоўцах (Крайск. воласці). Цэны на зямлю такіе: баравая пешчаная земля і балота с пад лесу—25 руб. дзесяціна; шэрэнькая—100—120 руб. дзесяціна; добрая земля (пад чорназём) 200—250 руб. дзес.; песчаная баравая—100 руб. дзесяціна.

**Г. Мікіцёнак.**

#### Ізноў вайна з беларускім календаром.

У нядзелю быў я у Докшыцах, (Віленск. губ., Вілейск. пав.) зайшоў у хаўрусыую краму і запытаўся календароў, падалі мне два.

— Чаму-ж вы так, калі ёсць што лепшаго хаваеця далёка што і не відаць?—Казаў я раскрываючы календар.—Самы найлепшы календар і хаваеця, якбы шкадуеця каб не куплялі... і стаў перэглядаць календар. Тут-жэ пры мне купілі, убачыўшы календар 4 чэлавекі. Я купіў 10 календароў для сябе і сваіх суседоў.

— Чаму-ж вы не прадаецё?

— Прадседацель (сьвяшчэннік) забараніў, а пасьля прыходзіў прыстаў і казаў, што ня можна прадаваць ..

Расказываюць селяне, хаўрусьнікі крамы, што на сабраньні членоў хаўрусу у лютым, адзін селянін адазваўся па беларуску. Яго перэдражніў і высьмеяў аграномніцкі стараста, селянін змоўк, і ніхто с членоў селян за яго і за сваю родую мову не заступіўся...

*Хаурусьнік.*

### З Міншчыны.

#### Цікавае казаньне.

Раз трапіў я у Б-цкую*) цэркву (Мінск. губ. і пав.) акурат: на казаньне. Было ужо па абедні і сьвяшчэннік вышоўшы з аўтара на сярэдзіну цэрквы, с крыжом у руках толькі што пачаў гаварыць казаньня. Сперша ён прачытаў «Возваніе къ православнымъ христіанамъ», напісанае, само сабой, па расейску, складам не саўсім зразумелым, ня толькі для неграматнаго селяніна, але нават і для добра граматнаго чэлавека. Прачытаўшы сьвяшчэннік стаў раз'ясьняць гэтае возваніе. Шмат чаго гаварыў ён, пра каталікоў, называючы іх „палякамі“, вылічаў усе плямы „польскаго“ духавенства і хваліў праваслаўнае. Гаварыў ён гэтак гадзіны с паўтары, але найболей зацікавіў мяне канец казаньня, каторы я прывяду у перэкладзі на беларускую мову, меней-болей даслоўна.

«Паждждыця цалаваць крыж: я вам скажу колькі *слоу аб* Беларусі... Ды не гамані-ж ты там стараста, калі я гавару! Баран ты гэткі! Ды перэстаньця кашляць... Кашляюць, кашляюць... ўсё роўна як чорт ведае што... Ну дык слухайця-ж! Расея —лепей рускіе—дзелюцца на тры часці: на вялікарусоў, маларусоў і беларусоў. Вялікарусы, — гэта самые чыстые, самые тыпічные рускіе людзі. Яны стварылі Расею; яны сабралі і ўзвышылі нашу бацькоўшчыну. З іхніх абласцей выйшлі Цары і правіцельства, каторае і цяпер кіруе сваей магутнай рукой неабнятняй старонкай, нашай бацькоўшчынай—Расеяй. Маларусы, гэта так сама народ расейскій, але яны крыху розняцца ад вялікарусоў. Маларусы гэты, або казакі, гэта высяленцы з Расеі. Гэты народ і сюды і туды: то ён прыставаў к татарам, то к палякам, у канцы прыстаў да расейцоў. Маларусы даволі вялікі народ, як па ліку, так і па сваей культуры: у іх ёсць свае абычаі, звычаі, песьні, яны маюць багатую літэратуру, вядомых пісьменнікоў і кобзароў.

Што-ж такое Беларусы? Гэта самы цёмны, самы забіты народ. Ды і каго мы можэм назваць беларусамі? Адных толькі парабкоў, а рэшта жыхароў гэтаго краю або расейцы, або палякі. У Беларусоў німа нічога свайго; ніводнай кніжкі вы не знайдзеця надрукаванай па беларуску. Праўда, ёсць адна брудная («грязная») газэтка «Наша Ніва». Ужо я ня ведаю як правіцельства трывае такую газэтку! Язык беларускі гэта самый дрэнный з усіх языкоў. Ды нават гэта не язык, а нейкае зьвяганьня («тявканье») і зьвягае («тявкает») чэлавек, як сабака ўсё роўна. Нашто вам «тявкать», калі вы можэця гаварыць чыстай расейскай літэратурнай мовай, якой гаварылі вашы бацькі і дзяды! На жаль, цяперашняя моладзь не даражыць сваім родным, асабліва многа такіх людзей паяўляецца сярод вучыцялёў, каторые гэтак сама пачынаюць «тявкать» і другім кажуць, каб і тые «тявкалі». Ад гэткіх людзей старанīцеся: гэта вашы самые горшые ворагі, пад лічынай спогаду. Амін.»

Пачалі цалаваць крыж.

— Ну што Дзёмка, пытае сьвяшчэннік, праўду я казаў?

— Праўду, бацюшка! Я сам чуў на свае вушы, як «палякі» гаварылі, што Цар с Царыцай і дзеці прынялі паляцкую веру...

— А цяпер, хто с паляцкаго краю, падступайця!—Агукнуў бацюшка.—Я раздам вам «Возваніе к праваслаўным хрысьціянам»!

— Я, бацюшка, і я, і я... с паляцкаго краю.

— А у вас там жывуць палякі?

— У нас у Прудзяншчыне адны палякі...

— Ну дык на табе.

— Дзякую, бацюшка!

— Дайця, калі ласка, і мне.

— А откуда?

— З Жукаўкі.

— Ну там рускіе, тебе не нужно... і т. д.

А інтэлігенцыя вясковая стаяла, збіўшыся у кучку і дзівілася слову „Божаму“, і горкіе сьлёзы крыўды душылі горла...

*Парахвіянін.*

*) Акуратны адрэс у Рэдакціі.

### З Могілеўшчыны.

**М-ко Радомля,** *Чауск. пов. Мог. г.* Кажуць вучоные, што мястэчка Радомля — пяршэйшая весь колішніх Радзімічоў. Можэ быць...

---

лей стары вучыцель,—царкоўнаго сьпеву; праца мая спорылася. бо многа было хлопчыкоў здольных з высокімі чыстымі галасамі. Як засьпевалі дзеткі у цэркві на сьвятой імшы, Божэ мой! Колькі радасьці было у парафіян Старые і малалые падыходзілі да мяне і дзякавалі цалуючы рукі... О, гэта народная падзяка, якім вялікім шчасьцям яна напаўняе нашэ сэрцэ! Як яна высіць і шырыць нашае смутнае, прыніжэнае жыцьцё!.. Маючы тагды дванадцаць рублёў жалаваньня, я лічыў сабе панам над панамі, багатыром над багатырамі.

Як толькі пачулі, што у Зарніцкай цэркві пад кірункам пачатковаго вучыцеля добра сьпеваюць, зараз па ўсяму павету пачалі мяне с хорам прызываць на спатканьня архірэя, губэрнатара і другіх важных асоб. Адусюль хвала мне ідзе, адсюль падзяка. Вучэнікоў маіх сталі з ахвотай прымаць у вучыцельску семінарыю. у паветовае вучылішчэ і ў іншые школкі. І шмат з іх выйшло вучыцелёў, пісароў, чыноўнікоў... Дзе вы цяпер, мае мілые дзеткі? Дзе Сымон Лабэйко, Лявон Лапацюк, Рыгор Кароцько, Антось Жыліч?.. Разыйшліся па ўсіх кутках белаго сьвету!.. Ах, як я хацеў бы на апошніх днях свайго жыцьця пабачыць вас, дзеткі, пагаварыць з вамі па душэ!.. Але не: разсыпаўшы пацеркі па дарозі, не збярэш іх зноў...

— Налій, паня, ешчэ чарку, бо вельмі смутак душу агарнуў...

Выпіўшы чарку слівянкі пан Трудоўскі далей казаў сам сабе:

— Усё йшло як належыць быць; адна беда вельмі уз'елося на мяне духавенство. Пачала без усякае дай рацыі шпігаваць мяне з усіх бакоў, — хоць не жыві на белым сьвеці. Раз у зарніцкаго бацюшкі быў зьезд духоўных асоб. Пазвалі мяне на зьезд дый кажуць: „Што ты гэта пан Трудоўскі, робіш: на што ты мужыцкіх дзяцей выводзіш у панства; як мужыкі стануць вучыцелямі ды пісарамі, то што тагды будуць рабіць нашы дзеці, быдла пасьвіць ці што?.. — „Што зрабіць, — атказваў я, — рожны у людзей бывае лёс: адны йдуць на гору, а другіе спушчаюцца з гары; хто быў апошнім, можэ, Бог дасць, стане першым“. «От як, —кажуць бацюшкі,—не, пачэкай, гэдак ня будзе: мы дабьемося, што цябе прыпыняць.

— «Што Бог дасць. — кажу, — тое і будзе. Сам с свае дарогі не зыйду: як верна служыў народу так і буду служыць...»

Гэтак працуючы, пражыў я мо гадоў с трыццаць. Падарваў сілы, састарэўся, аслабеў, — адным словам зьездзіўся конь. Начальства пабачыўшы гэта раптам адвярнуло нос...

От раз сяджу я сабе на ганачку і бачу падежджае пад вучылішчэ неякі панок. Прыглядаюся лепш—ага! — узнаю — гэта рэвізор, пан Пількоўскі... Вылез ён з брычкі, падышоў, прывітаўся дый кажэ:—«Я да вас па дзелу».—Вайшлі у кватэру маю, выпілі па шклянцы гарбаты і разгаварыліся. Рэвізор і кажэ:—„Я вам, пан Трудоўскі, прывёз вельмі кепскую абвестку: дырэкція вам дае атстаўку“... Я задрыжэў, як заяц у сабачых лапах. «А пэнсія, пытаюся, будзе»?—«Не, — гаворыць рэвізор, — пачатковым вучыцелям не паложэна пэнсія»...*)—„За якую-ж віну вы мяне гоніця? — пытаюся далей“. — «Трэ, кажэ, апарожніць месты дзеля маладых вучыцелёў: гэн у гэтым годзе скончыло Свіслацкую сэмінарыю сорак маладых хлапцоў, — гдзе-ж іх дзеваць?... От вам і прэдпісане дырэкціі“, — дакончыў пан Пількоўскі, тычучы мне у рукі паперу. Прачытаўшы гэтае прэдпісане, я аж самлеў і выпусьціў паперу з рук, так яно было жорстка ды прыкра напісана. А пан Пількоўскі вышоў паціху з мае кватэры, сеў у брычку і паехаў сабе далей..

— Паня, ешчэ чарку, бо збыць пячэ у грудзёх!

От і падзяка за сяўбу на ніві народнай, — думаў далей ўслух стары вучыцель,—праўду кажуць: служы пану верне, то пан нос адверне. Добра што ад бацькі дасталася — такая сяліба, а то прышлося-б сяўцу народнаму на старасьці жэбраваць ды сланяцца па чужых кутках.

Аставіў вучылішчэ і пераехаў сюды на бацькаўшчыну дажываць век... Цяжка жыць... Німа дастаткаў, німа здароўя, шчэзлі радасьці і надзеі... Усё прайшло, шчэзло як сон, як яснае прамене солца... Шчэзло безпаваротна, назаўсёды, на векі вечные..

І, схіліўшы сваю сівую голаў на грудзі, горка заплакаў стары вучыцель; плачэ і жонка гледзячы на яго. Плачуць абое старые, як дзеці; плачуць аб пройдзенным жыцьцю, што яно ужо ня вернецца ніколі, ніколі.

**К. Лейко.**

*) Тагды ешчэ пачатковым вучыцелям не давалі пэнсіі.

А цяпер тут ёсць троху жыдоў, некольні пратухлых крам, некольні пратрухлых мешчанскіх хатак і непраездные вуліцы.

А навокала ёсць тут аколіцы «польскіе», дзе жівуць людзі стану шляхоцкаго

Празываюць тыі людзі сабе палякамі, бо гэта ім на кожным кроку угаварывае начальство і панство; па польску-ж яны гаварыць ня ўмеюць і абэцадла польскаго не знаюць, а гаворуць, як і дзяды-прадзеды іх у сваей роднай беларускай мове, з наваротам сярод маладзежы „сьвецкай“ на мову «панськую» (расейскую).

Маюць зямлі па 5—10—15 дзесяцін, жывуць селянскім абычаем, але над селянамі сябе вывыжшаюць і мешацца с «чорнаю косткаю» высцерэгаюцца.

Бараду голюць і маліцца у касцёл на кані, у чорных вопратках, ездзюць.

У касьцелі казаньня бываюць і па літоўску, бо жыве тут жменя літвіноў, перэсяленцоў з губэрній Віленскай і Ковенскай, а сярод ксяндзоў у нас — літоўцы найчасьцей.

Такога казаньня, шанyючыйся, тутэйшы шляхціц саўсім ня слухае. У часе-ж польскаго казаньня на ксяндзовы рукі троху надзівіцца, а потым ціханька — шусь! на сьвентар пагаманіць.

Польскую мову у нас разумее толькі графіня Х-я і яе дворня.

Беларускую мову с 1839 году у нас с касьцёлу і цэрквоў выкінулі і парахвіяне, — не без пасторонняй помачы, — веруць, што завясьці яе ізноў у касьцелі —грэх: ня можна веру ламаць.

Цікавая наша старонка, да душы.

Шкада, што этнографы далёка ад зялезнай дарогі не залезаюць і па польску ці па расейку нас йшчэ не апісалі, ці апішуць— німа ведама. Мо й не патрапюць: наша старонка такая «дзікая» йшчэ, што апісаць нас не па нашку, ой, трудненька будзе...

Клічу сюды беларускіх мастакоў: тут яны знайдуць тыпічнатыпічны беларускі уклад жыцьця і дабудуць гарту у змаганьні за сваё — разумецца, калі гэта будуць душой беларусы, а не: „беларусы“.

Радзіміч.

## Ліст у рэдакцію.

*Высокапаважаны рэдактару!*

Просім памясьціць у Вашай паважанай газэці вось абчым:

Пры інстытуці Сельскай і Лясной гаспадаркі у Новай Александрыі (Пулавах) узнік «Студэнцкі гурток па вызучэньню Беларусі і Літвы».

Гурток адміністрацией інстытута ужо зацьверджэн і прыступае да працы.

Ен маніцца рабіць навуковые досьледы Беларуска - Літоўскаго краю з бакоў: сельска-гаспадарскаго, эканомічнага, лясногаі гістарычнаго.

Ен кіруецца да таго, каб даць Роднаму Краю навукова падгатаваных працаўнікоў, добра абзнаёмленых с тутэйшымі варункамі, жыцьцём і яго асаблівасьцямі.

Ен мае права: 1) збіраць сваю бібліотэку 2) рабіць навучные экскурсіі, 3) устраіваць чытаньня, навуковые сабраньня, 4) запрашываць да сябе спэціалістоў, каб чыталі у гуртку лекціі, каб памагалі у навучных досьледах, каб вадзілі экскурсіі.

Усякая помач ад людзей і грамад, спагадаючых цэлям гуртка, будзе прынімацца са шчыраю падзякаю.

**Урад Гуртка.**

Ново-Александрыя, Любл. губ. Інстытут Сельскай Гаспадаркі.

## З усіх старон.

**Агранічэньне Думы.**

Сэнат разьясьніў, што за прамовы у Гас. Думе, правіцельство мае права цягнуць пад суд дэпутатоў. І апіраючыся на гэтым разясьненьні хочуць выдаліць з Гас. Думы і пацягнуць пад суд дэп. Чхэідзе за прамову сказаную у Гас Думе. Шмат дэпутатоў з гэтай прычыны хочуць атказацца ад дэпутатцтва. Ходзюць чуткі, што калі Гас. Дума ня згодзіцца прызнаць гэтаго раз'ясьненья сэнату, і ня выключыць Чхэідзе, то Гас. Думу распусцюць Пурышкевіч ходзіць па Думе з мінай пабедніка і кажэ: «цяпер канец смуце».

**Важная нарада.**

Цяпер у Дэпартамэнцэ чужых вер адбываецца нарада з учасьцем губэрнатароў нашаго краю, пад маршалкоўствам віцэміністра ўнутрэнных спраў. Раюцца аб спосабах абрасеяньня Беларусоў і змаганьня с польшчынай. У праграму увайшлі такіе пытаньня: 1) аб гасударственнай службе у звязку з національнасцю працаўнікоў у правіцельственных і інш. установах; 2) аб народнай асьвеці (аб школах, казаньнях, навуцы веры, дадатковым набажэнстві і інш.)

**Планы абрусеньня Беларусі.**

«Западна-Русское Общ». і «Окраінный Союз» з нейкім Кадыгробавым ламаюць даўно ужо галаву як абрасеіць наш край і апошнімі часамі дадумаліся вось да чаго. Кадыгробов падае праект каб аткрыць у Мінску зямельны банк, каторы бы прадаваў зямлю сельскаму праваслаўнаму духавенству, чыноўнікам і вучыцелям, разумеецца толькі людзям чорнасоценнай маркі. Вядомы «прыяцель» беларусоў— Солоневіч у захваце ад гэтаго праекту «ратаваньня Беларусі». Ну, а што станецца з нашым беззямельнікам і малазямельнікам беларусам? Куды дзенуць тых гаротнікоў чыім потам і кроўю гэта зямелька здобрэна, хто яе карчэваў і зменяў у раджайную ральлю?...

**Арганізуюцца.**

Дэпутат Караваев арганізуе новую партію для аб'еднаньня людзей «національна-паступоваго кірунку» думак. Праграма партіі: 1) прызнаньне Расеі гасударствам національна-расейскім. 2) прызнаньне еднасці і не раздзельнасці расейскаго народу (не прызнаваньне беларусоў і украінцоў) і пакаваньне мовы і культуры расейскай, 3) ўзмацаваньне расейскай гасударственнасці, 4) падняцьце культурнай, ваеннай і экономічнай сілы Рассі. Адным словам праграма паходу на усё і усіх, што і хто не падходзіць і не прызнае Караваеўскіх «праўд».

**Новае брацтво.**

Незадоўга у ўкрайне і Беларусі заложыцца новае «брацтво» с палітычнай праграмай запазычэнай ад саюзу р. н. Новаму брацтву абецалі 100,000 рублёў субсыдіі.

**Філарэцкае Таварыство.**

Таварыш міністра народнай асьветы, Таўбэ, апублікаваў цыркуляр, у каторым дазваляе служачым пад міністэрствам народнай асьветы ўступаць у заложэнае Пурышкевічам філарэцкае таварыство, каторае самахоць будзе сачыць «крамолу» па школах.

**Вымогі монархістоў.**

Адбылося заседаньня монархічнаго комітэту, на каторым пастаноўлена звярнуцца да правіцельства, просючы яго, каб забараніло пісаць у газэтах благое аб правых організаціях.

**Засланьня.**

Па загаду міністра ўнутр. спраў выслалі с Пецярбурга сэкратарку газэты «Путь Правды» на тры годы «въ не столь отдалённые мѣста».

**Забастоўкі.**

С прычыны работніцкаго сьвята 1 мая (па заграничнаму календару) адбыліся па ўсіх гарадох Расеі, на адзін дзень, забастоўкі. У Рызе баставало аж 40,000 работнікоў

Проці работнікоў бастуючых у куштымскім горным округу паслалі войска.

**На вучыцелёў.**

У Гас. Думу будзе пададзено запытаньня чаму цісьне і скідае правіцельство вучыцелёў, участ нікоў вучыцельскаго зьезду. Зьезд быў пазволен правіцельствам.

**Забарона.**

У Кіеві адміністрація забараніла ушанаваць памяць памершаго украінскаго вучонаго філолога Міхальчука. На собраньні меліся чытаць аб працах гэтаго вучонаго.

**Бунт арэштантоў.**

У Житоміры арэштанты учынілі бунт: забілі вартаўніка, а другога цяжка пакалечылі; посьле падпалілі астрог. Паліція і войска стрэлялі у астрог. Забілі 6 арэштантоў і колькі душ пакалечылі. Парадак устаноўлен ужо.

## Жарты.

— „Вы ад якой губэрні?—Спытаў бюрократ дэпутата Тычыніна.

— Ад гродзенскай.

— Як жэ вы, русскій чэлавек, ды ешчэ правый, мог быць выбран ад гродзенскай губэрні? — Здзівіўся бюрократ

— Што-ж тут дзіўнаго? Спытаў у свой чарод Тычынін

— Як-же, *гэта-ж там толькі палякі.*

„Тычыніну прышлося доўга выясьняць бюрократу, што гродзенская губэрня ня менш расейская чым тульская ці разанская, што некольні дзесяткоў польскіх памешчыкоў ня робюць яе польскай, як ня могуць яе зрабіць і некольні тысяч абкаталічэных беларусоў, которые ешчэ ня выперліся сваей роднай мовы, хоць аб гэтым і стараюцца вельмі польскіе ксяндзы“.

(*С сурьёзнай стацці у Солоневічоускои газэці.*

Рэдактар **І Луцэвіч.**
Выдавец **А. Уласоў.**

**Слаўные СЕЯЛКІ чэскай фабрыкі МЭЛІХАРА ў Брондыс: лемешные Унікум, комбінаваные Імпэратар, да штучных навозоў Полёнія і талерачные.**

Сеялкі раскідаючые Эккерта 12, 10, і 8 ступовые самай навейшай канструкціі.

Сеялкі амэрыканскіе Супэріор лемешные комбінаваные і талерачные.

Сеялкі да навозоў арыгінальные Вэстфалія—Голіат Куксмана.

Плугі адноскібовые Сухэняго.

Двохскібоўцы Сухэняго, Завадзкаго і суцэльна стальные Эккерта.

Культыватары, бароны, валы, качалкі.

Значнікі і абсыпнікі. ямнікі да бульбы.

Машыны і прылады малачарскіе.

сулщь **ЗЫГМУНТ НАГРОДЗКІ**

**Вільня, Завальная № 11.**

**Знаменітые швэдзкіе цэнтрафугі**

**„ДІАБОЛО“**

**а такжэ масляркі, ціскачы, жбаны да малака, студзекнікі, цадзілкі, фільтры, фарба да масла і уселякіх малачарскіх прылад вялікі выбор**

Суліць **Зыгмунт Наргодзкі**

**Вільня, Завальная вуліца № 11.**

**Цэннікі на жаданьня высылаюцца адваротнай почтай.**

**!! Апошняе напомненьне !!**

**Даступна кожнаму**

**купіць вучастак зямлі у ЗВЯРЫНЦЫ** у самай лепшай часці гор. **Вільні**. Мейсцовасць прыгожая, здаровая, лес, рэка. **Цэны і варункі выгодные. С купляй паспешайця, зямлі** асталася саўсім мала! **РУПЦЕСЯ — купіць можэця толькі у гэтым сэзоне.** Па спраўмі звертацца у кантору па прадажы вучасткоў у Зьвярынцы: Вільня **„Звярынец“**, Георгіеўскі праспэкт, д. № 68. Тэл. № 46. **Спраўкі выдаюцца праз цэлы дзень, не вылучаючы 1 сьвят.**

Друкарня Мырціна Кухты, Татарская 20.